**Гарбачоў, М.** Ніколі не забудзем / М. Гарбачоў // Лепельскі край. – 2016. – 12 лют. – С. 4.

# *НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕМ*



*Генадзь Кулеш нарадзіўся ў 1966 годзе ў вёсцы Закаліўе Пышнянскага сельсавета. Ведаў пра вайну толькі з кніг і мастацкіх фільмаў, аповедаў аднавяскоўцаў-былых партызан і франтавікоў. Пасля заканчэння ў чэрвені 1984 года Лепельскага СПТВ-56 Генадзь уладкаваўся на працу механізатарам у калгас "Чырвоны партызан". У кастрычніку прыйшла павестка на тэрміновую службу ў армію. Чатыры лепяльчаніны былі накіраваны для праходжання службы ў Афганістан.*

– Акрамя мяне «пуцёўкі» на вайну тады атрымалі Віктар Дзівін, Уладзімір Садоўскі і Віктар Кузняцоў – усе вясковыя хлопцы, – адзначыў Генадзь Кулеш. – На жаль, ужо ў сакавіку 1985 года Уладзімір Садоўскі быў цяжка паранены і памёр у шпіталі. Ён пахаваны ў Цярэшках. Сёлета раптоўна пайшоў з жыцця і Віктар Дзівін з вёскі Гарадзец Стайскага сельсавета. Застаўся ў мяне з таго далёкага ўжо часу толькі адзін зямляк-баявы сябар і саслужывец Віктар Кузняцоў.

– Калі аказаліся непасрэдна на вайне?

– У пачатку 1985 года, а да гэтага тры месяцы набываў ваенную спецыяльнасць старшага радыётэлеграфіста ў вучэбцы ў Тэрмезе (Узбекістан). Трапіў у мотастралковы полк, размешчаны за пятнаццаць кіламетраў на поўдзень ад горада Кундуз. Служыў ва ўзводзе кіравання дывізіена самаходных артылерыйскіх установак. Усяго ў дывізіёне налічвалася 12 такіх установак. 3 дапамогай пераноснай рацыі забяспечваў карэкціроўку агню на адлегласці 7 – 10 кіламетраў.

Заўсёды самы небяспечны быў пераезд з нашай пастаяннай базы да заняцця пазіцыі пры выкананні баявой задачы па знішчэнні душманаў. Часам даводзілася перамяшчацца на адлегласць да 500 кіламетраў, рухацца па 2-3 дні, па дарозе неаднойчы трапляць пад абстрэлы ворага, асабліва калі пераадольвалі так званую "зялёнку" – густыя зарасці кустоўя, размешчаныя непадалёк ад дарогі. Удзельнічалі ў баях уваколіцах гарадоў Баглан, Пулі-Хумры, Мазары-Шарыф і іншых. Неяк усяго толькі за адзін дзень у 1985 годзе ў нашым палку загінула адразу 25 салдат-пехацінцаў. Не абышлося без страт асабовага саставу і ў нашым дывізіёне. У адной з баявых сутычак з душманамі загінуў афіцэр-камандзір нашага ўзвода кіравання і салдат. На месца забітага афіцэра хутка прыслалі новага, аднак і ён праз пэўны час трапіў пад варожую кулю. Праўда, трэцяму па ліку афіцэру-камандзіру нашага ўзвода кіравання больш пашчасціла. Ен працягваў служыць, паспяхова ратаваўся ад

абстрэлаў душманаў аж да маёй дэмабілізацыі з арміі. Бог злітасціўся, пашкадаваў і мяне: варожыя кулі праляцелі міма, не закранулі.

– Як завяршылі службу ў Афганістане?

– У лютым 1987 года на верталёце быў дастаўлены ў горад Хайратон, што непадалёк ад мяжы з Убекістанам. Затым на КамАЗе разам з іншымі ваеннаслужачымі пераехаў праз мост на рацэ АмуДар’я і аказаўся на тэрыторыі СССР. У Тэрмезе сеў на цягнік і з перасадкамі за восем дзён дабраўся да Лепеля.

– Як склаўся далейшы лёс?

– У 1987 годзе ўладкаваўся ў леспрамгас, дзе і зараз працую. Першых шэсць гадоў на трактары траляваў лес, а затым асвоіў прафесію кранаўшчыка машыніста. Цяпер працую на пагрузчыку ПЛ-1Г, загружаю драўніну на лесавозы.

– Ці вялікая сям’я?

– Жонка Алена працуе прадаўцом у магазіне спажывецкай кааперацыі. Сын Яўген асвоіў прафесію мантажніка, рупіцца ў прыватнага прадпрымальніка.

Летась сын ажаніўся. Маладыя жывуць разам з намі ў трохпакаёвай кватэры, якую ў свойчас пабудаваў і выдзеліў для маёй сям’і леспрамгас.

**Мікалай Гарбачоў**

**На здымку*: воін-інтэрнацыяналіст Г. Кулеш***

**Фота аўтара**